Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

**Серыя «З гісторыі прадпрыемстваў горада»**

# ВЫТВОРЦЫ ДЗІЦЯЧАЙ РАДАСЦІ

Да 25-годдзя з часу заснавання
**СТАА «ВП Палессе»**

***Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне***

Кобрын
2023

УДК 016:334.72(085+476.7)
ББК 91.9:65.298.11(4Беи)
В93

Серыя заснавана ў 2019 годзе

***Складальнік***
бібліёграф I катэгорыі цэнтральнай раённай бібліятэкі
*С. Д. Курачук*

В93 **Вытворцы дзіцячай радасці** : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 25-годдзя з часу заснавання СТАА «ВП Палессе» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; складальнік С. Д. Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2023. – 56 с. : фат. – (Серыя «З гісторыі прадпрыемстваў горада»).

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне з серыі «З гісторыі прадпрыемстваў горада» дае магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй заснавання і сённяшнім днём СТАА «ВП Палессе». Паказальнік адрасаваны ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца яго гісторыяй, культурай, эканомікай.

**УДК 016:334.72(085+476.7)**
**ББК 91.9:65.298.11(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма, 2023

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Вытворцы дзіцячай радасці» з серыі «З гісторыі прадпрыемстваў горада» выдадзена да 25-годдзя з часу заснавання сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «ВП Палессе».

Свой юбілейны дзень нараджэння «Палессе» сустракае ў статусе буйнога прамысловага прадпрыемства, якое перарасло рамкі не толькі рэгіянальнага, але і нацыянальнага маштабу. За 25 гадоў вытворчай і камерцыйнай дзейнасці СТАА «ВП Палессе» прайшло шлях ад маленькай кампаніі, навічка ў галіне выпуску дзіцячых цацак з пластмасы, да ўзроўню градаўтваральнага прадпрыемства, якое ўпэўнена стаіць на шляху мадэрнізацыі і асвойвання новых тэхналогій. У маштабнасці вытворчасці ў Рэспубліцы Беларусь СТАА «ВП Палессе» няма роўных.

Брэнд «Палесся» шырока вядомы ў многіх краінах свету. У 72 краінах цацкі гандлёвай маркі «Палессе» зарэкамендавалі сябе як бяспечны, цікавы і даўгавечны прадукт для дзяцей розных узростаў. На рынку тавараў для дзяцей СТАА «ВП Палессе» з'яўляецца адной з вядучых кампаній па вытворчасці пластмасавых цацак высокай якасці з экалагічна чыстых матэрыялаў сярод краін Еўропы і СНД. Прывабныя расфарбоўкі і непаўторны дызайн прадукцыі дазваляюць прадпрыемству займаць лідзіруючыя месцы, канкурыраваць з самымі вядомымі замежнымі фірмамі.

Выданне мае наступную структуру:

Ад складальніка

Гісторыка-эканамічны нарыс

*Як усё пачыналася*

*Год за годам: этапы станаўлення*

«ВП Палессе» – заўсёды на вышыні

*Шлях да поспеху*

*Добры след «Палесся»*

*Якасна працаваць - якасна жыць*

Спіс крыніц

Спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

Паказальнік уключае больш за 100 крыніц. Творы друку згрупаваны па відах. Кнігі размешчаны ў алфавіце аўтараў, назваў кніг, артыкулы – па гадах у зваротнай храналогіі, унутры года – у алфавіце аўтараў, загалоўкаў. Уключаны артыкулы з перыядычных выданняў, пачынаючы з 2003 года. Для раскрыцця зместу пры неабходнасці да запісаў даюцца кароткія даведачныя анатацыі. Адбор літаратуры завершаны ў лютым 2023 года. Даведачны апарат прадстаўлены алфавітным спісам перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

У выданні выкарыстаны фотаздымкі з фотагалерэі цэнтральнай раённай бібліятэкі, а таксама з сайта СТАА «ВП Палессе», іншых адкрытых інтэрнэт-крыніц.

Паказальнік адрасаваны ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца яго гісторыяй, культурай, эканомікай.

# ГІСТОРЫКА-ЭКАНАМІЧНЫ НАРЫС

## *Як усё пачыналася*



Гісторыя «ВП Палессе» пачынае свой адлік з 9 сакавіка 1998 года. На арандаванай пляцоўцы ў 200 квадратных метраў калектыў з дзесяці чалавек на адзіным ручным выдуўным станку выдаў першую прадукцыю. Самым першым таварам стала дзіцячая пірамідка ў выглядзе клоўна, сабачкі і качачкі.



Цяпер ў фае галоўнага корпуса стаіць той першы станок «Палесся» - як рарытэт, своеасаблівы экспанат, з якога пачынаецца кожная экскурсія для наведвальнікаў. Гэты станок

з’яўляецца адной з рэліквій прадпрыемства і беражліва захоўваецца, як музейны экспанат. Вядома, што сёння ў гасцей і супрацоўнікаў прадрыемства гэты «дыназаўр» выклікае ўсмешку.




Ля вытокаў стварэння СТАА «ВП Палессе» стаяла група маладых і амбіцыйных энтузіястаў-бізнесменаў на чале з Андрэем Гольцманам, Пятром і Уладзімірам Півакамі. Яны вырашылі стварыць прадпрыемства, якое б вырабляла дзіцячыя цацкі з пластмасы. Мэту ставілі высакародную - навучыцца вырабляць дзіцячыя цацкі высокай якасці, каб яны радавалі і развівалі малышню. Тым больш, што ў краінах былога СССР гэта галіна развівалася квёла, а асноўнымі пастаўшчыкамі прадукцыі выступалі такі прамысловы гігант, як Кітай, і іншыя замежныя фірмы. Дарэчы, у той час у Беларусі такім бізнесам ніхто практычна і не займаўся. Адсутнасць канкурэнцыі адначасова спрашчала і ўскладняла сітуацыю для прадпрымальнікаў.

Трэба адзначыць, што ў тыя гады знайсці і, галоўнае, атрымаць давер пакупніка было асабліва складана. Краіна знаходзілася на этапе ранняга эканамічнага развіцця, і ў любы момант можна было, не разлічыўшы тых ці іншых рызык, развітацца са сваёй справай.

Вопыт і веды напрацоўвалі літаральна з нуля. Даводзілася і рызыкаваць, каб заваяваць прэстыж і давер пакупнікоў. Паступова, крок за крокам, наладжвалі новую вытворчасць, асвойвалі невядомую раней справу, вучылі персанал. З кожным годам дзякуючы намаганням, ініцыятыве, актыўнасці кіраўніцтва прадпрыемства паступова пачало сваё дынамічнае развіццё. Планамерна ўмацоўвалася матэрыяльна-тэхнічная база, ствараліся новыя працоўныя месцы.

Ужо тады заснавальнікі і кіраўнікі «Палесся» разумелі, што галоўным фактарам у поспеху любой вытворчасці з'яўляецца згуртаваны калектыў аднадумцаў. Прадпрыемству патрэбны былі спецыялісты рознага профілю, якія займаліся б як стварэннем, выпускам і рэалізацыяй цацкі, так і адміністрацыйнай працай.

Першыя партыі прадукцыі для рэалізацыі былі завезены ў Расію. Але цацкі закупаліся суседзямі не так хутка, як хацелася б. І гэта зразумела, бо на той час брэнда «Палессе» яшчэ ніхто не ведаў. Прыходзілася доўга, практычна без аддачы, працаваць на свой аўтарытэт, каб прыцягнуць увагу патэнцыяльных пакупнікоў.

Прааналізаваўшы сітуацыю, вырашылі зрабіць акцэнт у вытворчасці на папаўненне асартыменту прадукцыі. Быў наладжаны выпуск пірамідак, некалькі ўдасканаленых і дапрацаваных аналагаў цацак, якія мелі высокі рэйтынг. Прадукцыя «Палесся» была з’арыентавана на дзяцей ва

ўзросце ад трох да васьмі гадоў. Карысталіся попытам інтэлектуальныя цацкі - цікавыя канструктары для хлопчыкаў і дзяўчынак. Прадукцыя прадпрыемства была значна таннейшая за знакаміты канструктар «Лега». І гэта не выпадкова, бо стратэгія «Палессе» накіравана на даступнасць цацак у цане розным слаям насельніцтва.

Амбіцыйныя ідэі, высокая працаздольнасць, мабільнасць і пастаянны творчы пошук далі свой плён. Нягледзячы на нялёгкія перыпетыі эканамічнай сітуацыі, прадпрыемства развівалася. Колькасць работнікаў расла, адкрываліся новыя цэхі, укараняліся найноўшыя тэхналогіі, уводзіліся ў строй сучасныя машыны і станкі, што дало магчымасць павялічыць якасць выпускаемай прадукцыі і пашырыць яе асартымент.

За дзесяць першых гадоў існавання прадпрыемства быў зроблены вялікі аб'ём работы. Наведвалі дальняе замежжа, дзе набіраліся вопыту, шукалі дзелавых партнёраў для далейшага супрацоўніцтва. Граматнае кіраўніцтва тых, хто стаяў і стаіць у руля «Палесся», дазволіла перажыць няпростыя часы і выдужыць пад напорам крызісных вятроў, а таксама даць магчымасць вытворчасці развівацца. Работнікі, якія давяралі дзеянням кіраўнікоў і напружана працавалі, застаючыся вернымі роднаму прадпрыемству, унеслі важкі ўклад у яго рост і развіццё. Актыўная падтрымка выканаўчай уладай раёна і вобласці ўсіх пачынанняў і ідэй калектыва і кіраўніцтва СТАА «ВП Палессе», безумоўна, таксама не магла не садзейнічаць умацаванню пазіцый фабрыкі.

## *Год за годам: этапы станаўлення*

З году ў год «Палессе» прырастала колькасна і якасна. У перыяд з **1999** года па **2005** год рос парк станкоў і пашыраўся асартымент цацак, павялічвалася колькасць супрацоўнікаў. Вытворчасць перамясцілася на больш прасторныя плошчы пустых цэхаў тэкстыльнай фабрыкі «Ручайка».



У **2001** годзе прайшла рэарганізацыя кампаніі ў сумеснае прадпрыемства з удзелам замежнага інвестара. З **2002** года пачалі выпускацца вырабы пад вядомай замежнай таварнай маркай «VISTA» (Чэхія). Асноўныя рынкі продажаў у гэты перыяд - Беларусь, Расія, Украіна.

З **2006** года на выкупленых плошчах прадзільна-ткацкай фабрыкі «Ручайка» размясціліся інструментальны, вытворчы і зборачны цэхі, склады гатовай прадукцыі, камплектуючых і паўфабрыкатаў. Заключана ліцэнзійнае

пагадненне на выпуск вырабаў пад таварнымі маркамі «Palau», «MOLTO» (Іспанія).

**2007** год быў для прадпрыемства асабліва значным. Менавіта ў гэтым годзе было праведзена перааснашчэнне вытворчасці станкамі фірм ENGEL і ARBURG, а таксама ўстаноўлены робататэхнічны IML комплекс Wittmann. На вытворчасці запушчана пнеўмазагрузачная сістэма падачы матэрыялу KOCH і сертыфікавана сістэма менеджменту якасці ICO 9001, што дазволіла выйсці на еўрапейскія рынкі.

У **2008** годзе колькасць працуючых у «Палессі» ўжо складала 1226 чалавек, вытворчасць была аснашчана 85 станкамі, а асартымент прадукцыі вырас да 700 найменняў.

За **2009** год калектыў павялічыўся на 400 чалавек, і на пачатку лютага **2010** года ў цэхах прадпрыемства было ўжо занята 1700 чалавек. Высакаякасная прадукцыя кобрынскіх руплівых прамыслоўцаў пастаўлялася ў 26 краін блізкага і далёкага замежжа. Разам з прадпрыемствам рос і калектыў сапраўдных майстроў, які прайшоў сур’ёзную прафесійную школу.

ПОЛЕСЬЕ®

У перыяд **2009-2010** гадоў на вытворчасці была ўстаноўлена цэнтралізаваная сістэма астуджэння ONI, праведзена міжнародная рэгістрацыя лагатыпа «Палессе» і пачаты выпуск ліцэнзійнай прадукцыі «Смешарыкі».

У **2011** годзе асвоены поўны цыкл вытворчасці прадукцыі. Выпуск склаў больш за 700 найменняў тавараў для дзяцей, а таксама больш за 100 відаў тавараў народнага спажывання з пластмасы, якія таксама карыстаюцца павышаным попытам.









У **2012** годзе быў набыты і асвоены ў інструментальным цэху 5-ці восевы металаапрацоўчы цэнтр HERMLE C42U і таксама набыты правы на выпуск прадукцыі пад гандлёвай маркай Wader Quality Toys. У тым жа годзе «Палессе» асвоіла выпуск электрамабіляў.




У **2012** годзе на «Палессі» за кошт абаротных сродкаў і банкаўскіх крэдытных рэсурсаў набыты новыя тэрмапластаўтаматы аўстрыйскай фірмы «ENGEL», якія прыйшлі на змену кітайскім. Такія станкі адрозніваюцца надзейнасцю, высокай прадукцыйнасцю, выконваюць найбольш цяжкія аперацыі, аблягчаюць працу людзей. Яны аснашчаны не толькі праграмным кіраваннем, але і пікерамі (механічная «рука»). Таксама набыты станкі нямецкіх фірмаў «DEMAG» і «ARBYRG», на якіх усталяваны робаты французскай фірмы «WITMAN».

Спецыяльная пнеўмазагрузачная сістэма нямецкай фірмы «Kosh» самастойна загружае неабходную колькасць сыравіны, вылічваючы яе літаральна да грама. А раней работнікі выконвалі гэта ўручную, ажыццяўлялі складаныя падлікі. Таксама набыта імпартнае абсталяванне для вырабу буйнагабарытных пластыкавых дэталяў для дзіцячых квадрацыклаў, матацыклаў і тавараў бытавога прызначэння.

Вынікам плённай працы калектыву СТАА «ВП Палессе» ў **2012** годзе стала пашырэнне рынкаў збыту сваёй прадукцыі: Канада, ЗША, Блізкі Усход, Афрыка. Па стане на 1 лютага **2013** года колькасць пакупнікоў павялічылася. У ліку партнёраў ужо значацца бізнесмены з Чылі, Мексікі і Кыргызстана. Кобрынскія цацкі пастаўляюцца ў 30 краін свету. У працэсе ўдзелу ў міжнародных выставах дзіцячай цацкі ў Нюрнбергу (Германія) і Маскве калектыў быў удастоены высокіх адзнак калег.

Перыяд з **2013** года па **2014** год аказаўся для кампаніі даволі плённым. Менавіта ў гэтыя гады быў запушчаны зборачны цэх у г. Пінску, адкрыты гандлёвы цэнтр «Палессе» ў Кобрыне і набыта права на выпуск

прадукцыі пад гандлёвымі маркамі «Cava-lino», «Coloma Y Pastor». Прадпрыемства стала лаўрэатам прэміі ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў вобласці якасці.

У перыяд з **2015** года па **2016** год упершыню было праведзена «Свята гульні і цацак "Палессе"», якое стала традыцыйным. У гэтыя ж гады пачаліся пастаўкі прадукцыі ў Японію і запушчана вытворчасць ліцэнзійнай прадукцыі Смурфікі і «Три кота», а таксама ўкаранёны кодэкс дзелавой этыкі BSCI. Адкрыўся першы фірменны магазін POLESIE ў Японіі.

У **2017** годзе ўкаранёна WMS-сістэма на складзе паўфабрыкатаў. Запушчана ў вытворчасць больш за 600 найменняў новага асартыменту. Завершана рэканструкцыя і здадзены ў эксплуатацыю адміністрацыйны будынак. Заключаны кантракт на выпуск ліцэнзійнай прадукцыі Disney Marvel і Miffi.

На студзень **2018** года колькасць працуючых у СТАА «ВП Палессе» склала 3042 чалавекі. Вытворчасць аснашчана 129 станкамі, вытворчыя плошчы склалі больш за 80000 квадратных метраў, а асартымент прадукцыі выйшаў на ўзровень больш за 3 500 найменняў.





У **2018** годзе група спецыялістаў фабрыкі цацак сабрала з канструктара аўтамабіль Geely Atlas у натуральную велічыню. На ўнікальную цацку пайшло 145 тысяч дэталяў. Гэты аўтамабіль важыць 1 756 кілаграмаў, больш за арыгінал. Творчая група - шэсць супрацоўнікаў - патрацілі на зборку 160 гадзін. І цяпер цацачны цуд тэхнікі карыстаецца папулярнасцю.




У **2019** годзе адкрыты вытворчыя пляцоўкі ў Расіі (г. Дзімітраўград) і Турцыі (г. Сіноп).

Пастуральнае развіццё СТАА «ВП Палессе» дазволіла яму ўвайсці ў спіс найбуйнейшых вытворцаў пластмасавай цацкі.

# «ВП ПАЛЕССЕ» – ЗАЎСЁДЫ НА ВЫШЫНІ

## *Шлях да поспеху*

Сёння вытворчы комплекс СТАА «ВП Палессе» ў сваім сегменце рынку з'яўляецца адным з лепшых у Еўропе і дазваляе выпускаць самы шырокі асартымент цацак і гаспадарча-бытавых тавараў.



Колькасць работнікаў прадпрыемства па стане на 2022 год складае больш за 2 750 чалавек.

«Палессе» займае цэлы квартал на ўскраіне Кобрына – 80 000 квадратных метраў вытворчых і склад-скіх плошчаў. Працуюць 63 структурныя падраздзяленні, у якіх установлена 130 самых сучасных машын.

Прадпрыемства выпускае прадукцыю пад гандлёвымі маркамі «Палессе», «Wader Quality Toys», «Molto», «Palau», «Coloma Y Pastor». Акрамя асартыменту ўласнай распрацоўкі «Палессе» ажыццяўляе выпуск ліцэнзійных прадуктаў. На сённяшні дзень ліцэнзійны партфель уключае ў сябе: «Disney», «Marvel», «Смурфікі», «Міфі», «Mammoet», «Volvo», «Белаз», «Смешарыкі», «Три Кота»,САЮЗМУЛЬФІЛЬМ», «Бі-Бі Знайкі».



У сучасных цэхах на самым найноўшым тэхналагічным абсталяванні выпускаюцца для дзяцей яркія, вясёлыя цацкі, прызначэнне якіх не проста арганізоўваць вольны час дзіцяці, але і развіваць іх разумовыя і маторныя навыкі. Штогод СТАА «ВП Палессе» актыўна пашырае асартымент прадукцыі, павышае яе якасць. Заваявалі давер кліентаў навінкі прадпрыемства — цацкі прэміум-сегмента, а таксама электрамабілі і квадрацыклы.



Развіццё экспартнага патэнцыялу – адзін з прыярытэтных вектараў вытворчай палітыкі прадпрыемства. У менеджараў «Палесся» насычаны рабочы графік, звязаны з замежнымі камандзіроўкамі, што істотна пашырае геаграфію рэалізацыі прадукцыі.

Перспектыву развіцця СТАА «ВП Палессе» кіраўніцтва бачыць у інтэнсіфікацыі вытворчасці, у шырокім ужыванні аўтаматызаваных сістэм, што дазволіць пры іншых роўных умовах павялічваць рэнтабельнасць вытворчасці. Цяпер гэта сусветная практыка, без ужывання якой немагчыма канкурыраваць на рынкавай прасторы. Каб прадпрыемства было прыбытковым, а работнікі атрымлівалі дастойны заробак, неабходна эфектыўна працаваць і вырабляць якасную прадукцыю.



СТАА «ВП Палессе» ажыццяўляе актыўную выставачную дзейнасць, з'яўляецца пастаянным удзельнікам усіх буйных айчынных і міжнародных выставак. Прадстаўнічыя дэлегацыі, у склад якіх уваходзяць вядучыя менеджары прадпрыемства, прэзентуюць узоры сваёй прадукцыі на ўнутраных і знешніх рынках. «Палессе» актыўна ўдзельнічае ў буйнейшых выставах, якія праходзяць у Беларусі, Расійскай Федэрацыі, Украіне,

Германіі, Польшчы, Нідэрландах, Аб’яднаных Арабскіх Эміратах, Ганконгу, Японіі і Аўстраліі. Кожны год кобрынскае прадпрыемства становіцца ўдзельнікам разнастайных прэстыжных выстаў дзіцячай цацкі ў Нюрнбергу (Германія), Маскве, Новасібірску, Кіеве, удастойваецца высокіх узнагарод.

Непасрэдны кантакт з пакупнікамі дае магчымасць лепш даведацца аб запатрабаваннях рынка. Такія прадстаўнічыя форумы дапамагаюць быць заўсёды ў трэндзе, а таксама даюць цудоўныя магчымасці для наладжвання дзелавых кантактаў з патэнцыяльнымі кліентамі.

СТАА «ВП Палессе» двойчы станавілася лаўрэатам Рэспубліканскай прэміі ў галіне якасці з уручэннем адпаведных дыпломаў. Акрамя таго, яму неаднаразова прысуджаліся дастойныя ўзнагароды на прэстыжных міжнародных выставах.

У 2020 годзе фабрыка «Палессе» стала пераможцам XXI рэспубліканскага конкурсу спажывецкіх пераваг «Прадукт года - 2019» у намінацыі «Тавары для дзяцей», а таксама атрымала ГРАН ПРЫ як лідар вытворчасці высакаякасных пластмасавых цацак у намінацыі «Тавары для дзяцей» за прадукт «Лагічны цeрамок» (у сетачцы). «Прадукт года» з’яўляецца першай і найбуйнейшай у свеце незалежнай грамадскай прэміяй як для ўжо зарэкамендавалых сябе



на рынку, так і інавацыйных тавараў, конкурсам, якія праводзіцца метадам нацыянальнага апытання спажыўцоў.

«Палессе» таксама прымае ўдзел у міжнародным кірмашы дзіцячых тавараў і цацак Kids Time. На выставе «KIDS RUSSIA 2020», якая праходзіла ў Маскве на тэрыторыі МВЦ «Крокус Экспа – станцыя метро Мякініна», на стэндзе «Палесся» быў прадстаўлены ўвесь асартымент прадукцыі, якая вырабляецца прадпрыемствам, а таксама навінкі года.










У 2021 годзе ў Маскве праходзіла XXVI міжнародная прамысловая выстава нехарчовых тавараў HOUSEHOLD EXPO (Крокус Экспа), на якой «Палессе» прадставіла ўвесь актуальны асартымент прадукцыі гаспадарча-бытавога прызначэння, а таксама прэзентавала калекцыю металічнага посуду.

У верасні 2022 года ў Маскве на тэрыторыі ЦВК «Экспацэнтр» праходзіла XXVII міжнародная выстава «Свет дзяцінства - 2022», на якой быў прадстаўлены поўны







асартымент тавараў, а таксама навінкі 2022 года. У 2022 годзе фабрыка «Палессе» стала пера-можцам народнай прэміі «Выбар «Бацькоў» у намі-нацыі «Дзіцячыя цацкі». Па выніках народнага галасавання ў намінацыі «Мадэль года» прадпрыемства таксама стала пераможцам у катэгорыі «Дзіцячыя цацкі».







У прадпрыемства шмат новых творчых планаў, якія даюць усе падставы сцвярджаць, што ў «Палесся» ёсць добрыя магчымасці і рэзервы для далейшага дынамічнага развіцця.

## *Добры след «Палесся»*

Цяпер нават цяжка сабе ўявіць Кобрын без «Палесся». Гэта самае вялікае ў горадзе прадпрыемства. Аднак градаўтваральнае прадпрыемства - гэта не толькі высокія даходы і трывалае становішча на сусветных рынках, але і вялікая адказнасць, якая праяўляецца ў пастаянным удзеле ў развіцці свайго рэгіёна.

Практычна няма такой сферы жыцця Кобрыншчыны, у якой не знайшлося б добрага следу «Палесся». Сярод буйнейшых прыкладаў - рэканструкцыя вуліцы Нікалаева, якая дзякуючы спонсарскай дапамозе прадпрыемства набыла сучасны выгляд. Выдатна ацанілі кабрынчане і аўтобусы, што бясплатна давозяць пасажыраў да магазіну СТАА «ВП Палессе», а разам з тым і ў бліжэйшыя раёны.

Прадпрыемства - пастаянны спонсар разнастайных спартыўных і культурных мерапрыемстваў горада і раёна, падтрымлівае будаўніцтва праваслаўных храмаў, прымае актыўны ўдзел ва ўсіх раённых мерапрыемствах. «Палессе» аказвае living рознабаковую дапамогу Кобрынскаму дзіцячаму дому, дзіцячай вёсцы, парку культуры і адпачынку імя А. В. Суворава, валейбольнаму клубу «Алімп», камандзе па пляжным футболе і многім іншым арганізацыям і ўстановам.

У 2011 годзе СТАА «ВП Палессе» на раённым і абласным узроўнях удастоена ганаровага звання «Лепшы прадпрымальнік-мецэнат». Паводле афіцыйных даных, на дабрачынныя мэты тады прадпрыемства выдзеліла больш за 100 тысяч долараў ЗША ў эквіваленце.

У першыя дні чэрвеня да Дня абароны дзяцей і заканчэння вучэбнага года супрацоўнікі найбуйнейшай у

нашай краіне фабрыкі цацак узводзяць цэлы горад дзіцячай мары, які займае дзесяць тысяч квадратных метраў - праводзяць для дзяцей Кобрына і Кобрынскага раёна «Свята гульні і цацак». З кожным годам свята становіцца ўсё больш маштабным і папулярным, колькасць яго ўдзельнікаў павялічваецца. Кобрын на той час сапраўды становіцца горадам дзяцей. Нездарма ж свята ўганаравалі сваёй прысутнасцю дыпламаты, парламентарыі, госці з іншых рэгіёнаў краіны і замежжа.



У 2020 годзе кампанія «Палессе» на бязвыплатнай аснове перадала кобрынскім медыкам апарат для штучнай вентыляцыі лёгкіх ВІАН-3-турба, а таксама аднаразовыя ахоўныя камбінезоны і шчыткі.





У рамках дабрачыннай акцыі «Каждому глазику капельку заботы» прадпрыемства зрабіла гораду дастойны падарунак, закупіўшы для дзіцячай бальніцы складанае сучаснае афтальмалагічнае абсталяванне.

# *Якасна працаваць - якасна жыць*

Атмасфера ў калектыве - гэта асноўны фактар паспяховай працы СТАА «ВП Палессе». Людзі павінны адчуваць, што для іх прадпрыемства - гэта другі дом, дзе ў цяжкую хвіліну табе заўсёды працягнуць руку дапамогі.

Удасканальваючы вытворчасць, нарошчваючы аб'ёмы продажу прадукцыі, на «Палессі» шануюць чалавека. Работнікі забяспечаны ўсім неабходным для выканання сваіх абавязкаў, у цэхах строга выконваюцца санітарныя нормы па вентыляцыі паветра, камфортны тэмпературны рэжым. Безумоўна, высокая культура вытворчасці, добры заробак — гэта вельмі важна, але трэба, каб і вольны час быў змястоўным, цікавым.

На «Палессі» ёсць умовы для ўсебаковага развіцця асобы, яе творчых здольнасцей. Для ўсіх жадаючых адчынены дзверы трэнажорнай і спартыўнай залаў, дзе бясплатна з працаўнікамі прадпрыемства праводзяць заняткі па фізкультуры кваліфікаваныя інструктары-метадысты. Рэгулярна праводзяцца спартакіяды, тур-злёты, разнастайныя конкурсы.



Тут умеюць цікава адпачываць. Нават на стэндах у калідоры галоўнага корпуса можна ўбачыць маляўнічыя ілюстрацыі з разнастайных спартакіяд, канцэртаў, святаў. Аматараў творчасці запрашаюць калектыў мастацкай самадзейнасці, розныя гурткі, дзе кожны работнік можа рэалізаваць свой талент і здольнасці. Дарэчы, удзельнікаў

калектыву самадзейнасці СТАА «ВП Палессе» добра ведаюць не толькі ўнутры прадпрыемства, але і ва ўсім Кобрыне. Гарадскія святы, сярод якіх і Дзень горада, не абыходзяцца без іх выступленняў. Аб шматгранным, захапляючым жыцці калектыву расказвае ўласнае выданне прадпрыемства «Палескія навіны».



На «Палессі» ганарацца тым, што супрацоўнікі атрымліваюць годную зарплату, маюць прыстойны сацпакет. Кожны работнік у сваім гандлёвым цэнтры, фірменным гіпермаркеце «Палессе», можа набыць у лік зарплаты любыя тавары - ад прадуктаў харчавання да будаўнічых матэрыялаў. Дарэчы, універсальны гандлёвы цэнтр ацанілі не толькі гараджане, але і жыхары раёна, а таксама суседніх рэгіёнаў. Прадуктовы аддзел тут працуе да 23 гадзін, што зручна для людзей, якія позна працуюць альбо вяртаюцца з паездак. Папулярнасцю карыстаецца аддзел дзіцячых тавараў, у тым ліку цацкі.

На прадпрыемстве стварыліся сямейныя працоўныя дынастыі, якіх зараз каля ста, ушаноўваюцца ветэраны вытворчасці. І гэта добры паказчык таго, што пра людзей тут клапоцяцца. А супрацоўнікі ў сваю чаргу ведаюць, што ад іх намаганняў, адказнасці, ініцыятывы і актыўнасці залежыць поспех усёй арганізацыі. Такія адносіны да справы з’яўляюцца адным з галоўных сакрэтаў выдатнага іміджу і поспеху прадпрыемства. СТАА «ВП Палессе» - адзіны зладжаны механізм!

## СТАА «ВП ПАЛЕССЕ» - вытворчасць дзіцячых пластмасавых цацак бездакорнай якасці і дызайну!



## Гарантыя якасці, высокая прадукцыйнасць, імкненне да лепшага - візітная картка ФАБРЫКІ ЦАЦАК «ПАЛЕССЕ»

***Ва ўсе часы самым жаданым дзіцячым падарункам былі і будуць цацкі - прыгожыя, яркія, цікавыя і, зразумела, якасныя. Такія, якія вырабляюцца ў СТАА «ВП Палессе» - буйнейшым прадпрыемстве Кобрыншчыны. Сёння «Палессе» - гандлёвая марка, якой таты і мамы больш як у 70 краінах свету давяраюць самае дарагое - сваіх дзяцей.***

# СПІС КРЫНІЦ

**Кобринский район. Совместное предприятие «ПП Полесье»** // Брестчина производит, предлагает, приглашает : каталог-справочник / отдел внешней торговли ком. пром-ти и торговли Брестского облисполкома, предприятие «Техн. Центр-88». – Барановичи, 2004. – С. 152.

**Кобринский район. ООО «Полесье»** // Брестчина производит, предлагает, приглашает / сост. М. П. Евтух и др. – Барановичи, 1999. – С. 147.

**Лешкевич, А. А.** СООО «ПП Полесье» / А. А. Лешкевич // Мая Радзіма – Беларусь / А. А. Лешкевич. - Брэст, 2008. – С. 108-110.

**Полесье** : каталог игрушек. 2001. – Кобрин, 2001. – 21 с. : фот.

**Совместное общество с ограниченной ответственностью «ПП Полесье»** // Предпринимательство Брестчины / сост. Управление предпринимательства комитета экономики Брестского облисполкома. – Брест, 2011. - С. 12 : фот.

**Юбілейныя** даты прадпрыемстваў і ўстаноў горада і раёна. **СТАА «ВП Палессе»** - 25 гадоў з часу заснавання // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская РЦБС, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 101.

**Семенов, С.** «ПП Полесье»: в ногу со временем / Сергей Семенов // Брестский калейдоскоп. - 2022. - 5 января (№ 1). - С. 1 : фот.

**Сергеев, И**. Игрушки для Москвы / Иван Сергеев // Заря. - 2022. — 8 октября (№ 80). — С. 13.

Кобринское СООО «ПП Полесье» представило свою продукцию на международной выставке «Мир детства».

**Арсеньева, С.** Пять причин побывать на белорусских фабриках / подготовила Софья Арсеньева // Народная газета. – 2021. - 5 февраля (№ 5). - С. 16. - (Союзное вече).

Вернуться в детство – фабрика «Полесье».

**Вовк, Ю.** Расширение производства игрушек «Полесья» / подготовила Юлия Вовк // Кобрин-информ. – 2021. – 23 сентября (№ 38). – С. 4.

Вторая очередь производства детских игрушек фабрики «Полесье» была запущена 15 сентября на территории Димитровградского индустриального парка «Мастер».

**Курачук, С.** История кобринского края в лицах : Почётный гражданин Кобринского района / страницу подготовила Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2021. – 26 августа (№ 34). – С. 4.

Очередная страница совместного проекта Кобринской центральной районной библиотеки и газеты «Кобрин-информ» посвящена почётным гражданам Кобринского района, в т. ч. директору «Полесья» А. Гольцману.

**Сергеев, И**. Игрушки для Казахстана / Иван Сергеев // Заря. - 2021. — 11 августа (№ 63). — С. 17.

Кобринское предприятие СООО «ПП Полесье» представит свою продукцию на международной выставке в Казахстане.

**Сергеев, И**. Электричество, тепло или холод / Иван Сергеев // Заря. - 2021. — 8 мая (№ 36). — С. 3.

Кобринское СООО «ПП Полесье» запустило собственный энергетический центр.

**Спортивный** трофей «Полесья» // Кобрин-информ. – 2021. – 14 октября (№ 41). – С. 2.

Команда кобринского «Полесья» стала обладателем главного трофея районного чемпионата по футболу «Триум-флига».

**Волков, С**. Игрушки для Турции / Сергей Волков // Заря. – 2020. – 25 января (№ 8). - С. 3.

Кобринское СООО «ПП Полесье» успешно развивает зарубежную производственную сеть.

**Елизарова, Ж.** Здесь исполняются детские мечты / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 22 ліпеня (№ 56). — С. 4 : фот.

Игрушки торговой марки «Полесье» — безопасный, интересный и долговечный продукт для детей разных возрастов.

**Игрушки** торговой марки «Полесье» «осваивают» новые рынки // Кобрынскі веснік. - 2020. - 22 студзеня. – С. 3.

Состоялось открытие производственной площадки совместного турецко-белорусского предприятия по выпуску детских игрушек торговой марки «Полесье».

**Кобринское** «Полесье» шьет медикам комбинезоны и печатает защитные щитки на 3D принтере // Кобрин–информ. - 2020. – 7 мая (№ 19). – С. 4.

**Красовский, И.** Индустрия детских грез / Илья Красовский, Валентина Козлович // Рэспубліка. - 2020. — 9 кастрычніка (№ 191). — С. 10, 11 : фот.

Несмотря на эпидемию коронавируса, производство детских игрушек в СООО «ПП Полесье» упало незначительно.

**Сергеев, И**. Едем в Нюрнберг / Иван Сергеев // Заря. – 2020. – 15 января (№ 5). - С. 3.

Кобринский производитель игрушек СООО «Полесье» представит свою продукцию на крупной выставке Spielwarenmesse в немецком Нюрнберге.

**СООО «ПП Полесье»** передала Кобринской центральной районной больнице аппарат ИВЛ // Кобрин – информ. – 2020. – 28 ноября (№ 22). – С. 4.

**Ализар, К.** Продукт года выпускают на Полесье / Ксения Ализар // Кобрынскі веснік. – 2019. – 13 красавіка. – С. 2.

Звания «Продукт года» удостоилась продукция СООО «ПП Полесье».

**Бакун, А.** Свята шчаслівага дзяцінства / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2019. — 5 чэрвеня. — С. 4.

Адбылося свята гульні і цацкі «Палессе».

**Бакун, Е.** Капелька в океане добра / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2019. — 29 мая. — С. 5.

СООО «ПП Полесье» — организатор благотворительного проекта «Вместе мы можем сделать многое».

**Вовк, Ю.** «Полесье» — с заботой о детях / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2019. — 6 июня (№ 23). — С. 3.

Пятый раз состоялся праздник игры и игрушек «Полесье».

**Волков, С.** Российский вектор / Сергей Волков // Заря. - 2019. — 20 февраля. — С. 3.

СООО «ПП Полесье» подписало соглашение об открытии новой производственной площадки в г. Дмитровце (Россия, Ульяновская область).

**Гольцман, А**. Горад, дзе збываюцца мары / Андрэй Гольцман // Кобрынскі веснік. – 2019. – 20 ліпеня. – С. 3.

Дырэктар СТАА «ВП Палессе» А. Гольцман аб горадзе свайго дзяцінства - Кобрыне.

**Елизарова, Ж.** Взрослые знают, что нужно детям / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2019. — 27 ліпеня. — С. 4 : фот.

СООО «ПП Полесье» предлагает новую серию игрушек.

**Елизарова, Ж.** Кобринские игрушки на мировой арене / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2019. — 28 снежня (№ 100). — С. 1—2 : фот.

Об ассортиментной политике СООО «ПП Полесье».

**Елизарова, Ж**. Тепла и любви не бывает много / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2019. — 4 снежня (№ 94). — С. 4 : фот.

На СООО «ПП Полесье» расширяют и обновляют ассортимент выпускаемых игрушек.

**Игрушки** «Полесья» будут производиться в Ульяновской области // Кобрынскі веснік. - 2019. — 23 красавіка. — С. 3.

СООО «ПП Полесье» открыло первую линию производственной площадки детских игрушек в г. Дмитровоград Ульяновской области.

**Иовик, В**. Собери свое Лего! / Валерия Иовик // Заря. - 2019. — 9 февраля. — С. 18.

К премьере мультфильма «Лего Фильм 2» СООО «ПП Полесье» подготовило тематическую выставку.

**Леоновец, Н**. Приоритет — на многодетность / Нина Леоновец // Заря. - 2019. — 2 февраля. — С. 5.

Кобринская фабрика игрушек «Полесье» строит новый завод с опережением графика.

**Сергеев, И.** Игрушки для России / Иван Сергеев // Заря. - 2019. — 2 октября. — С. 3.

Кобринское СООО «ПП Полесье» открыло фабрику игрушек в России.

**Сергеев, И.** Наши товары в Гонконге / Иван Сергеев // Заря. – 2019. – 19 января. – С. 3.

Кобринское СООО «Полесье» представило свою продукцию на международной выставке игрушек, которая на днях завершилась в Гонконге.

**Белов, Д**. СООО «ПП Полесье» : гордость кобринчан / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2018. — 14 ліпеня. — С. 3.

**Борисенко, С.** Дарите детям только лучшее / Светлана Борисенко // Советская Белоруссия. - 2018. — 6 апреля. — С. 14.

СООО «ПП Полесье» получило диплом конкурса «Продукт года 2017».

**Бялоў, Д**. Якасць сусветнага ўзроўню / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2018. — 17 лютага. — С. 2.

Прадукцыя СТАА «ВП Палессе» экспартуецца ў больш за 60 краін.

**Васюк, Н.** В Кобрине прошел масштабный праздник игры и игрушек «Полесье - 2018» / Наталья Васюк // Вечерний Брест. - 2018. - 8 июня. - С. 24. – (Приложение: Вечерочка. - № 22).

**Вовк, Ю.** Живем играючи! / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2018. — 7 июня. — С. 5.

Состоялся праздник игрушек «Полесье».

**Вовк, Ю.** С юбилеем, «Полесье»! / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2018. — 22 марта. — С. 3.

СООО «ПП Полесье» отметило 20-летний юбилей.

**Вовк, Ю.** ТЦ «Полесье»: 4 года с заботой о покупателях / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2018. — 16 августа. — С. 2.

Торговый центр «Полесье» отметил четвертый день рождения.

**Волков, С**. Время собирать награды / Сергей Волков // Заря. - 2018. — 14 апреля. — С. 2.

